Інфармацыя Аналітыка Публіцыстыка

№2 сакавік 2011

# ПРЭЗУМПЦЫЯ

Гарадзенскі праваабаронча інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

## На Гарадзеншчыне ўзбуджана чарговая крымінальная справа:

### *На публіцыста і грамадскага актывіста Андрэя Пачобута заведзена крымінальная справа за абразу прэзідэнта*



28 сакавіка, ведамы гарадзенскі публіцыст і грамадскі дзеяч непрызнанага ўладамі Саюзу Палякаў Беларусі Андрэй Пачобут быў выкліканы ў Гарадзенскую пракуратуру, дзе яму паведамілі, што супраць яго распачатая крымінальная справа паводле артыкулу за абразу прэзідэнта. У матэрыяле справы фігуруюць 8 артыкулаў журналіста ў польскай "Газеце выборчай", а таксама па адным артыкуле на асабістым блогу Андрэя Пачобута і на сайце "Белорусский партизан".

Журналіста выклікалі ў пракуратуру, дзе ўручылі копію дакументаў і спрабавалі дапытаць у якасці падазраванага. Відаць, з гэтае прычыны напярэдні Андрэю не дазволілі выехаць з краіны, хоць тады тлумачэння Пачобуту не далі. У пракуратуры Андрэя Пачобута папярэдзілі пра тое, што зараз ён мусіць з'яўляцца на допыты і даваць паказанні.

Гарадзенскія журналісты, сябры Беларускай Асацыяцыі Журналістаў, 30 сакавіка правялі экстраннае паседжанне, на якім было вырашана падрыхтаваць і накіраваць ліст пратэсту ў Гродзенскую абласную пракуратуру. Незалежныя журналісты абураныя іх пастаянннай дыскрымінацыяй і татальным праследам, а таксама тым фактам, што пракуратура распачала крымінальную справу па артыкуле за абразу прэзідэнта ў дачыненні да Андрэя Пачобута, вядомага публіцыста і блогера, уласнага карэспандэнта "Gazety Wyborczej".

Гродзенскія журналісты і праваабаронцы пратэстуюць супраць гвалтоўнага парушэння іх канстытуцыйных правоў і заклікаюць пракуратуру спыніць рэпрэсіі і закрыць крымінальную справу Андрэя Пачобута.

***Паводле першага пункту арт. 386 КК, журналісту пагражае пакаранне ў выглядзе штрафу або пазбаўлення волі тэрмінам да двух гадоў.***

### Краты

*Ці то бедны, ці багаты*
*Хоча ў хаце ставіць краты,*
*Каб з сям'ёю і сябрамі*
*Вечаркамі і дзянькамі*
*За гарбатай, чаркай, скваркай*
*Бухаць, квасіць аж да ранку.*
*Але ж колькі трэ заботы,*
*Каб прыдбаць да хаты дроты.*
*Маня, Ваня, Антак, Чэсь,*
*Разабралі й „Мерседэс",*
*Што ў двары стаяў без фараў*
*Прызабыты гаспадарам.*
*Трэба ж пілiць, рэзаць, цёгаць*
*І суседзяў не спалохаць,*
*Міліцыянтаў не баяцца,*
*Стукачам жа ўсміхацца.*
*Усё для славы, для прэстыжу,*
*То й жалеза перакіну.*
*А за гэтай беганінай,*
*Беларускай цыганінай*
*Часам нервы не стрывалі*
*І ўлады папракалі*
*То за чэргі за валютай,*
*За развалены абутак,*
*За капусту, што не кісне*
*І смярдзіць калі прыціснеш,*
*А то бульба па даляры,*
*Ў Польшчу з'ездзіць толькі мары.*
*Пакуль краты сталявалі*
*Пры акне аб тым брахалі.*
*Нехта добра іх заслухаў,*
*Каму трэба і застукаў.*
*Не мінулі й дзве гадзіны*
*Як прыперлі ў гасціну,*
*Моцна ў дзверы застучылі,*
*Каб ім хутка адчынілі.*
*А нам сполах і праклён,*
*Давай, збежым на балкон.*
*Калі беглі, то спазналі:*
*У пастку з кратаў мы папалі.*
*Дзе ж гарбата, чарка, скварка,*
*Ужо вядуць нас у кайданках,*
*Пратакол на ўсіх складаюць,*
*Апазіцяй абзываюць.*
*О мой Божа! Дрэнна справа.*
*Вось і скончылась забава!*
*Забяруць у нас жа краты,*
*Штраф не сплацім і на раты.*
*Трэба к нарам нам звыкацца*
*З-за крат у неба ўглядацца.*

*Ява*

# Праверка на вашывасць

Ідэі справядлівасці, свабоды і роўнасці неаднаразова авалодвалі розумам і душамі тых, хто ахвяраваў сабой дзеля іх спаўнення. І чалавецтва, прайшоўшы праз пасля-рэвалюцыйныя жахі і бясконцыя цяжкасці перыядаў перамен, заўсёды імкнулася зразумець, як адрозніць тых, хто імкнецца да рэалізацыі вялікіх, хоць на той канкрэтны момант часу толькі тэарэтычных дасягненняў найвышэйшай чалавечай думку і патрабаванняў чалавечага сэрца, ад пустаслоўя і падману карыслівых і бязлітасных прыстасаванцаў, пасля кіравання якіх і патоп здаецца толькі невялічкай непрыемнасцю. І ў розных кутках свету, у розных краінах, людзі рана ці позна пачыналі прыходзіць да адной і той жа высновы, што галоўным паказчыкам шчырасці ўсялякага кіраўніка ёсць выкананне ім правоў чалавека, павага да правоў чалавека і пастанова у цэнтр развіцця грамадства менавіта правоў чалавека. Бо толькі там, дзе шануюцца правы чалавека, пачынаюць дзейнічаць усе астатнія формулы гарманічнага і справядлівага развіцця грамадства.

Правы чалавека, гэта лакмусавая паперка, якая можа стэставаць кожнага кіраўніка. Як кажуць у народзе, зрабіць праверку на вашывасць. Бо калі у краіне ёсць праўна зацверджанае смяротнае пакаранне, то яно ёсць. І нікуды гэтага не схаваеш. Бо калі пракуратура замест кантролю над міліцыяй будуе з ёй сумесныя планы дзеянняў, а суддзі ходзяць пад час працэсу кансультавацца з не суддзямі, то гэта пошукам справядлівасці не назавеш. Гэта і ёсць паказчыкам, як улада ставіцца да правоў чалавека.

Рыба, як сцвярджае народная мудрасць, пачынае гніць з галавы. А пасля гэтая хвароба вялага гніення разрастаецца і паступова іфіцыруе ўсё грамадства. Напачатку хварэць пачынае тое, што да галавы бліжэй. А пасля і ўсё астатняе. Людзі зняверваюцца ў ідэалах, перастаюць верыць у дабро. Проста перастаюць верыць. Ва ўсё. Кожны пачынае змагацца сам за сябе, а значыць супраць іншых.

Але светлы бок чалавечай натуры большасці людзей не можа з гэтым зміріцца. Бо людзі хочуць жыць па-чалавечу. І яны ўсё часцей выходзяць з патрабаваннямі шанаваць іх правы. Шанаваць іх людскасць. І выкананне уладай правоў чалавека ставяць у галоўныя патрабаванні. У прыярытэты. Асвета прынесла гэтыя ідэалы ва ўсе куткі планеты, і людзі ўсё больш разумеюць, што ад выканання ўладай менавіта правоў чалавека залежыць і ўсё астатняе. Людзі пачынаюць адстойваць свае правы, змагацца за іх, ахвяраваць за гэтыя ідэалы. І не важна ў арабскім ці славянскім свеце чалавек хоча жыць годна. Важна, што ён гэтага хоча.

Гісторыя ўжо павярнула колы свайго вечнага гадзінніка, і час пайшоў. Людзі пачалі настойліва дамагацца выканання іх правоў. Яны маюць на тое права. Час цемрашальства і спробаў вярнуцца ў багну тыраніі заканчваецца. Апошнія падзеі ў свеце таму пацвярджэнне.

***Віктар С азонаў***

# С в я т а з п р ы с м а к а м

25 Сакавіка – гэта асаблівая дата ў беларускім календары. Гэта галоўнае нацыянальнае свята, якое ніяк, на жаль, не можа стаць дзяржаўным, увасобіць спрадвечныя беларускія мроі. І тут з прыкрасцю можна канстатаваць, што сто гадоў перыядычнага змагання за сваю асобнасць і суверэнітэт так і не прынеслі чаканай вольнасці. Нібыта на мапе Еўропы існуе такая дзяржава – незалежная Рэспубліка Беларусь, але па-сутнасці гэта квазі-дзяржава, чужая для беларусаў, якая мае каланіяльную расійскую адміністрацыю і многія прыкметы расійскай ускраіны. Гэта сапраўднае дзікунства, што сёння беларусы не могуць узняць на Дзень Волі свой нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг. За яго ўздыманне ці вывешванне затрымліваюць, даюць вялікія грашовыя кары ці садзяць у турму.

Бальшыня людзей хоча жыць нармальным у нейкім сэнсе мяшчанскім жыццём: хадзіць на працу, размнажацца, адпачываць на моры, уладкоўваць свае кватэры, дамы і гаражы, мець добрыя машыны. Нічога заганнага ў такіх памкненнях няма. Але ж ёсць і старая як свет біблейская мудрасць – не хлебам адзіным жыве чалавек. І вось тут упіраемся ў тое, што няма сярод нашай нацыі сапраўднай грамадзянскай супольнасці, няма належнай салідарнасці, няма разумення галоўнага – у якой сітуацыі мы знаходзімся.

Падзеі 19 снежня 2010 году выразна паказалі, што актыўная частка грамадства хоча пераменаў, стамілася ад савецкага маразму, ад хлусні дзяржаўнай прапаганды. Што зноў ёсць людзі, здольныя ахвяраваць сама дарагім у сваім жыцці дзеля вольнасці сваёй краіны. Аднак, крытычнай масы для кардынальнага павароту да нармальнасці яшчэ недастаткова. Гутарка тут не пра тое, што ўсе павінны па першым поклічы выходзіць на вулічныя акцыі пратэсту і рабіць радыкальную рэвалюцыю. Насамрэч формаў негвалтоўнага грамадзянскага супраціву досыць шмат і яны могуць стаць досыць эфектыўнымі. Прыкладам байкот у розных яго праявах: байкот спартовых спаборніцтваў і эстрадных канцэртаў, байкот і ігнараванне дзяржаўных газет і тэлебачання. Кожны чалавек здольны не зрабіць нечага на сваім канкрэтным месцы, што супярэчыць яго светагляду і сумленню.

25 сакавіка – гэта зазвычай пачатак сапраўднай вясны, так чаканай у нашых шыротах пасля зацяжной і нуднай зімы з яе маразамі і вятрамі, невыноснай вільготнасцю, якой хіба няма нідзе на свеце. Вясна – гэта заўсёды абуджэнне, ажыванне і адраджэнне. “Толькі з кожнай вясной усё вастрэй адчуванне фіналу”, магчыма нас стамляюць гады і палітычныя паразы, здзекі над беларускай культурай, дыскрымінацыя нашай беларускай мовы. Але ж і “скалу прабівае расток”!

25 сакавіка – гэта яшчэ і Звеставанне паводле аднаго з каляндарных стыляў. Вялікдзень сёлетняй вясной будзе сустракацца ўсімі канфесіямі разам.

Дзень 25 сакавіка – светлае свята беларусаў усяго свету з прысмакам горычы. Свята чарговай надзеі з прысмакам маральнай стомленасці. Свята Адраджэння з адчуваннем фатальнай непазбежнасці, што ўсё ізноў паўторыцца...

***Уладзімір Хільмановіч***

# Вынікі 2010 году: палітыка “лібералізацыі” завяршылася небывалымі рэпрэсіямі і масавымі арыштамі



***Праваабарончы цэнтр “Вясна” рыхтуе да выданьня традыцыйную гадавую справаздачу “Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2010 годзе”. Пра тое, чым гэты год быў адметным у грамадзка-палітычным жыцьці краіны, піша старшыня ПЦ “Вясна”, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі.***

2010 год у жыцьці краіны выдаўся надзвычай напружаным і дынамічным. У студзені ў Беларусі пачалася кампанія выбараў у мясцовыя саветы (самі выбары былі прызначаныя на 25 красавіка). Яна была цікавай тым, што гэта была першая выбарчая кампанія, якая праходзіла пасьля прыняцьця паправак у выбарчае заканадаўства. Надзвычай важна было прааналізаваць і на практыцы ўбачыць, якім чынам гэтыя зьмены паўплывалі на большую дэмакратычнасьць і празрыстасьць выбарчага заканадаўства, з улікам таго, што ў канцы году намячалася правядзеньне прэзідэнцкіх выбараў. Буйныя праваабарончыя арганізацыі Беларусі ПЦ “Вясна” і БХК ініцыявалі грамадзкую ініцыятыву “Праваабаронцы за свабодныя выбары”.

Выбары ў мясцовыя саветы адбыліся ў красавіку, кампанія не выклікала заўважнай грамадзкай актыўнасьці. Арганізатары маніторынгу “Праваабаронцы за свабодныя выбары” прыйшлі да высновы, што істотных зьменаў у правядзеньні выбараў, нягледзячы на зьмены выбарчага заканадаўства, не адбылося. Уладамі не былі ўлічаныя рэкамендацыі па ўдасканаленьні выбарчага заканадаўства як збоку беларускіх палітычных партыяў і НДА, так і збоку БДІПЧ АБСЕ. Былі зафіксаваныя масавыя парушэньні дэмакратычных стандартаў правядзеньня выбараў.

Улады працягвалі праводзіць апрабаваную ў 2009 годзе тактыку кропкавага стрымліваньня грамадзянскай ды палітычнай актыўнасьці. Так, новы 2010 год пачаўся з эскалацыі канфлікту ўладаў з непрызнаным Саюзам палякаў у Беларусі, які цягнуўся ўжо ня першы год. Была ўзбуджаная крымінальная справа супраць рэгіянальнай актывісткі арганізацыі, дырэктаркі Івянецкага польскага дому Тэрэзы Собаль, і ў лютым праз суд Польскі дом у Івянцы перайшоў да праўладнага Саюзу палякаў у Беларусі. Усё кіраўніцтва ды некалькі актывістаў “непаслухмянага” саюзу палякаў у Беларусі былі адміністрацыйна пакараныя, і толькі ўмяшальніцтва ўладаў Польшчы замарозіла гэты канфлікт.

З мінулага 2009 году працягвала разгортвацца крымінальная справа супраць ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча і ягоных калегаў, якія спрабавалі змагацца з карупцыяй на мясцовым узроўні. Вялікая ўвага міжнароднай супольнасьці, а таксама беларускіх праваабаронцаў змусілі Вярхоўны суд адмовіцца ад большай часткі абвінавачваньняў, такіх як – наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці і падрыхтоўка тэрарыстычнага акту. Паводле гэтых правінаў пракуратура патрабавала для М.Аўтуховіча 20 гадоў зьняволеньня. 6 траўня Вярхоўны Суд Беларусі вынес прысуд: трое абвінавачаных былі асуджаныя за незаконныя дзеяньні ў адносінах да агністрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. М. Аўтуховіч атрымаў 5 год і два месяцы калоніі ўзмоцненага рэжыму, У. Асіпенка і А. Ларын – па тры гады зьняволеньня. Былы міліцыянт Міхаіл Казлоў быў асуджаны на два гады пазбаўленьня волі. Беларускія праваабронцы прызналі гэты крымінальны працэс палітычна матываваным.

Гэтаксама ў 2010 годзе перасьледваліся маладыя людзі, якія адмаўляліся служыць у войску па рэлігійных матывах. Так, са сьнежня 2009 году ў Жодзінскім СІЗА ўтрымліваўся вернік адной з пратэстанцкіх абшчынаў Іван Міхайлаў, якога абвінавачвалі па арт.435 Крымінальнага кодэксу РБ (“ухіленьне ад прызыву ў войска”). 1 лютага 2010 году ён быў асуджаны да 3-х месяцаў арышту. "Amnesty international" прызнала І.Міхайлава “вязьнем сумленьня”.

Працягвалася тактыка ўладаў па адмове ў рэгістрацыі новых няўрадавых арганізацыяў, палітычных партыяў, па забароне масавых мерапрыемстваў і па нерэгістрацыі новых СМІ. Так, 3 лютага быў асуджаны на 10 сутак адміністрацыйнага арышту Іван Шульга, сябра грамадзкай арганізацыі "Беларуская асацыяцыя журналістаў". ¨н быў затрыманы ў Менску пры спробе міліцыі ўварвацца ў кватэру, дзе на той час знаходзілася прадстаўніцтва незарэгістраванага ўладамі беларускамоўнага спадарожнікавага тэлеканалу Белсат. У лютым 8 незалежных выданьняў мелі адмовы ў рэгістрацыі. Гэтаксама адмовілі ў рэгістрацыі грамадзкаму аб’яднаньню “Берасьцейская вясна” і партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя.

Люты 2010 году быў адметны пасьлядоўна жорсткім разгонам міліцыяй некалькіх публічных акцыяў, якія праходзілі ў Менску 8, 14 і 16 лютага. Удзельнікаў зьбівалі пры затрыманьні, перавозцы ў РУУС і нават у самім пастарунку. Журналістам перашкаджалі здымаць затрыманьні. У выніку беларускія праваабарончыя арганізацыі пайшлі на беспрэцэндэнтры крок, зьвярнуўшыся да сілавых структураў з прапановаю правесьці перамовы па тэме жорсткага абыходжаньня міліцыянтаў з удзельнікамі мірных акцыяў, а таксама наконт неабгрунтаваных рэпрэсіяў супраць актывістаў Саюзу палякаў у Беларусі. Праваабарон-

цамі была прынятая адпаведная заява. З кіраўнікоў МУС, КДБ і пракуратуры на перамовы ніхто не зьявіўся, але крок праваабаронцаў паўплываў на зьмяншэньне гвалту над мірнымі дэманстрантамі ў наступныя некалькі месяцаў.

Нечаканы ўдар атрымала пратэстанцкая царква "Новае жыцьцё", канфлікт якой з-за царкоўнага будынку з менскімі гарадзкімі ўладамі цягнуўся ўжо некалькі гадоў. Абшчына была аштрафаваная за "шкоду навакольнаму асяроддзю" на суму роўную 90 тысячам даляраў.

У сакавіку 2010 году беларускія ўлады паказалі, наколькі непасьлядоўнай была абвешчаная імі новая палітыка "лібералізацыі". Праваабаронцы праз родных даведаліся, што, нягледзячы на неаднаразовыя звароты міжнароднай супольнасьці і беларускіх праваабаронцаў з патрабаваньнем устрымацца ад прывядзеньне ў выкананьне сьмяротнага пакараньня, два сьмяротныя прысуды ў дачыненьні да Андрэя Жука і Васіля Юзэпчука былі выкананыя. Таксама была праігнараваная і аналагічная просьба Камітэту ААН па правах чалавека, які прыняў да разгляду скаргі асуджаных. Міжнародныя арганізацыі (Рада Еўропы, Еўрапарламент і Парламенцкая Асамблея АБСЕ) былі ўражаныя жорсткасьцю беларускіх уладаў і выказалі сваё абурэньне і шкадаваньне. Камітэт ААН па правах чалавека абвінавацію беларускія ўлады ў парушэньні міжнародных абавязальніцтваў.

Праз пару месяцаў, 14 траўня, у Беларусі выносяцца чарговыя сьмяротныя прысуды двум жыхарам Гродна Алегу Грышкаўцову і Андрэю Бурдыка. Гэта адбылося літаральна праз два дні пасьля суровай і ўсеагульнай крытыкі ў адрас Беларусі падчас прадстаўленьня ў Жэневе на сесіі Савету правоў чалавека ААН Універсальнага перыядычнага агляду, справаздачы аб становішчы з правамі чалавека у Беларусі. Урад нашай краіны праігнараваў абсалютную большасьць рэкамендацыяў, выказаных іншымі дэлегацыямі і беларускімі праваабаронцамі. Яшчэ адзін сьмяротны прысуд Магілёўскі абласны суд вынес гомельцу Ігару Мяліку ў верасьні.

Улетку 2010 году міністэрства інфармацыі шчодра раздавала папярэджаньні незалежным газетам, пагражадаючы фактычна закрыцьцём. Так, папярэджаньні атрымалі "Народная воля", "Новы час" (двойчы), "Товарищ" і "Наша ніва"(таксама двойчы). За крытыку мясцовых уладаў была ўзбуджана крымінальная справа супраць рэдактара незалежнага бюлетэня "Бойкі Клецак" Сяргея Панамарова, які быў вымушаны эміграваць, калі справа была ўжо перададзеная ў суд.

16 жніўня быў арыштаваны, нібыта за прадастаўленьне падробленай даведкі аб заробку, беларускі паэт і выдавец Міхась Башура. Сапраўдная прычына ягонага арышту была ў тым, што ён, як выдавец, шчыльна супрацоўнічаў з грамадзянскай кампаніяй "Гавары праўду". 19 кастрычніка, пасьля трох месяцаў арышту, Савецкі райсуд Менску прызнаў яго вінаватым па двух частках арт. 380 КК РБ і прысудзіў да выплаты штрафу ў памеры 500 базавых велічыняў, а гэта 17 мільёнаў 500 тысячаў рублёў.

14 верасьня Палата прадстаўнікоў абвясьціла аб прызначэньні выбараў прэзідэнта Беларусі на 19 сьнежня. Вылучэньне А.Лукашэнкі ў чацьвёрты раз на пасаду прэзідэнта не выклікала сумненьня, што тычыцца альтэрнатыўных дэмакратычных кандыдатаў, то стратэгія вылучэньне адзінага кандыдата ад апазіцыі не знайшла падтрымкі ў значнай частцы дэмакратычнага актыву, і яны пайшлі на выбары асобнымі калонамі. Раздробленасьць дэмакратычных сілаў задавальняла аўтарытарныя ўлады, і пры такім сцэнары "лібералізацыі" краіны ім адводзілася роля масоўкі.

У выніку, з адзінаццаці прэтэндэнтаў, якія здалі больш за сто тысяч подпісаў, пасьля праверкі гэтых подпісаў напачатку лістапада былі зарэгістраваныя 10 з іх. І хаця этапы выбарчай кампаніі, якія датычыліся рэгістрацыі ініцыятыўных груп кандыдатаў, а таксама збору подпісаў за іх вылучэньне, праходзілі ў адносна спакойнай абстаноўцы, фармаваньне выбарчых камісіяў адбывалася ў недэмакратычным рэжыме і толькі 0,25% прадстаўнікоў дэмакратычных партыяў здолелі ў іх патрапіць. Такім чынам, магчымыя фальсіфікацыі падчас падліку галасоў, а значыць і самі вынікі выбараў былі ўжо закладзеныя ў далейшую хаду выбарчай кампаніі. Апроч гэтага, назіральнікі былі пазбаўленыя магчымасьці назіраць за працэсам праверкі сапраўднасьці подпісаў, сабраных у падтрымку прэтэндэнтаў.

Аднак агітацыйная кампанія ўсіх дзевяці альтэрнатыўных кандыдатаў урэшце здолела разбудзіць актыўнасьць беларускага грамадзтва.

19 студзеня ўвойдзе ў гісторыю беларускага народу як "крывавая нядзеля". Зусім непадалёк, на прывакзальнай плошчы, сто пяць гадоў таму, 18 кастрычніка 1905 года па тайным загадзе менскага губернатара Паўла Курлова за патрабаваньне вызваліць палітычных зьняволеных і за антыцарскія лозунгі была расстраляная мірная дэманстрацыя. Загінула каля 80-ці чалавек і каля трохсот было паранена. Пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу. Але расьсьледваньне прыйшло да высновы, што губернатар Курлоў "меў права прыняць рашучыя меры". Затым у адместку было два пакушэньні на Паўла Курлова, і ён толькі цудам застаўся жывым.

19 сьнежня перакрэсьліла ўсе спадзяваньні аптымістаў на паступовую лібералізацыю і дэмакратызацыю беларускага рэжыму. Аўтарытарная ўлада сказала – не. І закруцілася бяздушнае кола рэпрэсіяў. Дзесяткі грамадзкіх актывістаў ды простых удзельнікаў акцыі пратэсту патрапілі ў СІЗО КГБ і МУС. Іх абвінавацілі ў "масавых беспарадках". Ім пагражае шматгадовае (да 15-ці гадоў) зьняволеньне. Болей за 700 дэманстрантаў прайшлі праз судовы канвеер і былі асуджаныя ў адміністрацыйным парадку, па краіне пракацілася хваля вобшукаў і допытаў, колькасьць якіх пераваліла за дзьве сотні адных і другіх. Вобшукі і допыты гэтаксама закранулі журналістаў і праваабаронцаў. Такога маштабу парушэньняў правоў чалавека ў краіне ў новай гісторыі яшчэ не было.

19 сьнежня дзясяткі тысячаў беларускіх грамадзянаў таксама сказалі сваё рашучае – НЕ выбарчым фальсіфікацыям і чацьвёртаму запар тэрміну бясьсменнаму прэзідэнту. І жорсткія рэпрэсіі ў дачыненьні да сваіх палітычных апанентаў – гэта лепшы доказ таго, што ўлады іх пачулі.

Так скончыўся 2010 год. Не заўсёды пацярпелыя зьяўляюцца прайграўшымі. І не заўсёды той, хто выйграў становіцца пераможцам.

*Алесь Бяляцкі*

# Хроніка пераследу актывістаў Гарадзеншчыны (сакавік 2011)

**9 сакавіка** позвы, каб зьявіцца ў Менск у КДБ Беларусі для даваньня паказаньняў па справе 19 сьнежня, атрымалі сябры БХД з Навагрладку Уладзімер Качагур і Юры Казак. Да Дар'і Бахар з КДБ таксама прыхodзілі на працу, але яе ў гэты час не было. Яшчэ аднаго актывіста Сяргея Ваўчка не засьпелі дома.

**10 сакавіка** журналісту Андрэю Пачобуту было даслана афіцыйнае папярэджаньне Гарадзенскай пракуратуры за працу на польскую «Gazetu Wyborczu» без акрэдытацыі. У папярэджаньні канстатуецца, што тэрмін акрэдытацыі Андрэя Пачобута пры МЗС Беларусі скончыўся яшчэ **24 лютага 2009** годе і ня быў працягнуты, а на сайце выданьня дагэтуль пад ягоным прозьвішчам публікуюцца матэрыялы, якія асьвятляюць падзеі ў Беларусі.

**14 сакавіка** на беларуска-польскай мяжы з раніцы затрыманы аўтамабіль, у якім ехаў гарадзенскі праваабаронца Віктар Сазонаў. На памежным пераходзе Берастявіца-Баброўнікі ў кірунку Польшчы беларускія памежнікі сьпярша доўга некуды бегалі і, відаць, раіліся з кіраўніцтвам, пасля чаго забралі ў Сазонава пашпарт. Легкавы аўтамабіль адставілі ў бок. Мытнікамі быў праведзены дагляд.

**16 сакавіка** ў Астраўцы быў затрыманы і дастаўлены ў мясцовае аддзяленьне міліцыі карэспандэнт інтэрнэт-газеты «Салідарнасьць» Сяргей Балай. Журналіст прыехаў у камандзіроўку па рэдакцыйным заданьні каб апытаць мясцовых жыхароў, як яны ставяцца да будаўніцтва Астравецкай АЭС, улічваючы апошнія падзеі ў Японіі. Міліцыянты завезьлі Балая ў мясцовы аддзел унутраных спраў, дзе ўзялі тлумачэньні, а пасьля адпусьцілі.

У Гародні пачалі зноў актыўна выклікаць грамадскіх актывістаў на дактыласкапію. Выпадак з прадстаўніком БХК Раманам Юргелем падаецца ўвогуле ўнікальным. Увечары **16 сакавіка** на яго кватэру заявіўся старэйшы лейтэнант аддзелу наркакантролю і супрацьдзеяння гандлю людзьмі Кастрычніцкага РАУС гораду Гродна Аляксандар Хваленя. **Увечары 17 сакавіка** міліцыянты прышлі на кватэру іншага праваабаронцы Уладзіміра Хільмановіча. Яны прапанавалі праехаць на дактыласкапію. Хільмановіч адмовіўся ад гэтага.

**18 сакавіка** ў Гародні распачаўся адміністрацыйны працэс супраць моладзевай актывісткі Кацярыны Герасімчык. Яе вінавацяць у нанясенні графіці на помнік Леніна. Адміністрацыйны працэс па артыкуле "дробнае хуліганства" вядзе вядомая сваімі "палітычнымі" прысудамі ў Гродне суддзя Ленінскага раённага суду Наталля Козел.

**Напярэдадні 25 сакавіка** гродзенская міліцыя масава абыходзіла і тэлефанавала мясцовым грамадска-



палітычным актывістам з пытаннем, ці не збіраюцца яны выязджаць на святкаванне ў Мінск. Супрацоўнікі міліцыі звярнуліся з гэтай нагоды да Вадзіма Саранчукова, Сяргея Антусевіча, Валерыя Кісяля, Міколы Лемяноўскага, Яна Лялевіча, Міколы Баўсюка, Юрыя Істоміна, Уладзіміра Хільмановіча, іншых грамадскіх актывістаў. Прадстаўнікі міліцыі раілі актывістам не выязджаць у сталіцу Беларусі менавіта 25 сакавіка.

**23 сакавіка** ў Гродне судом Ленінскага раёну быў працягнуты адміністрацыйны працэс па справе Кацярыны Герасімчык, якую вінавацяць у нанясенні графіці на помнік Леніну, што стаіць каля гарвыканкаму.

**Распачатая крымінальная справа ў дачыненні да журналіста выдання «Gazeta Wyborcza» Анджэя Пачобута.** Яго вінавацяць у абразе Прэзідэнта Беларусі.

Пра гэта яму паведаміў пракурор Гродзенскай вобласці В.Н. Марозаў.

"Пачобут А, С. (...) у перыяд 2010-2011 г.г. размясціў у глабальнай камп'ютэрнай сетцы Інтэрнэт на сайтах www.wyborcza.pl, belaruspartisan.org і poczobut.livejournal. створаныя ім тэкставыя публікацыі, азагалоўленыя " Час закручваць гайкі "," Лукашэнка знайшоў чарговую мэту "," У Беларусі выбары без выбару "," Кажаце мне бацька "," Так кіруе Лукашэнка "," Лукашэнка: Ды я сфальсіфікаваў выбары "," Свабода па-беларуску. Пакаяўся так выйшаў? ","Перадвыбарчы папулізм па-беларуску "" Так палохае беларускі КДБ "і адзін тэкст без загалоўка пачынаецца словамі" Дзякуй усім ... "і сканчаецца словамі" ... можаце выкарыстоўваць ", у якіх утрымліваюцца прыкметы публічнай абразы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ... "

Дыфамацыйны артыкул 368 Крымінальнага кодэксу РБ "Публічная знява Прэзідэнтра Рэспублікі Беларусь" прадугледжвае пакараньне ў выглядзе штрафу альбо папраўчых работ на тэрмін да 2 гадоў, альбо арыштам на тэрмін да 2 месяцаў. Альбо абмежаваньнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**29 сакавіка** супрацоўнікі КДБ наклалі арышт на хатнюю маёмасць Андрэя Пачобута. Такія "следчыя дзеянні" былі праведзены ў выніку распачатай Крымінальнай справы.

Гродзенскія ўлады па-ранейшаму не пакідаюць у спакоі незалежную праваабаронцу, сябру Беларускага Хельсінкскага камітэту Святлану Рудкоўскую. У лютым бягучага году яе тройчы выклікалі ў Аддзел барацьбы з эканамічнай злачыннасцю Ленінскага раёну. Падставай паслужылі скаргі шэрагу састарэлых жыхароў дому, у якім Рудкоўская з'яўлялася старшынёй ЖБК. А ў сакавіку пачаліся новыя праблемы – Рудкоўскай паведамілі, што адбываецца разгляд таго, што яна нібыта падрабіла подпісы людзей, калі яе два гады таму абіралі старшынёй жыллёва-будаўнічага кааператыву.

Праваабаронца лічыць такія праявы пераследам за свой актыўны ўдзел у апошніх выбарчых кампаніях, калі яна была незалежнай назіральніцай і склала шэраг скаргаў на парушэнні выбарчага заканадаўства.

# Алесь Бяляцкі: «Такога маштабу рэпрэсіяў у краіне не было ніколі»



*У сакавіку у Менску працягваліся судовыя працэсы па крымінальнай справе, узбуджанай ўладамі пасьля падзеяў 19 снежня 2010 года. Пад ціскам Расіі двум грамадзянам РФ былі вынесены буйныя штрафы, а грамадзянін Беларусі пакараны не пазбаўленьнем волі, а толькі яе абмежаваньнем без накіраваньня ва ўстанову адкрытага тыпу – так званай "хатняй хіміяй". Але ці сьведчыць гэта пра паляпшэньне сітуацыі, якая склалася пасьля 19 сьнежня мінулага году? На гэтую тэму мы разважае віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі па правах чалавека, кіраўнік Праваабарончага цэнтру "Вясна", адзін з каардынатараў грамадзянскай ініцыятывы "Праваабаронцы за свабодныя выбары" Алесь Бяляцкі.*

**Безумоўна, 19 сьнежня пачаўся новы этап у сучаснай гісторыі нашай краіны. Якія яго наступствы для беларускай грамадзянскай супольнасьці?**

Падчас выбарчай кампаніі мы, праваабаронцы, бачылі сваю ролю ў арганізацыі назіраньня за прэзідэнцкімі выбарамі. Мы пацьвердзілі нашу кааліцыю з Беларускім Хельсінкскім Камітэтам, якая сфармавалася ў 2008 годзе для назіраньня за парламенцкімі выбарамі. Наша задача была простай: прасачыць за тым, наколькі выбарчы працэс адказвае беларускаму заканадаўству і стандартам АБСЕ. Сваю задачу мы выканалі. А вось палітыкі, якія ішлі на прэзідэнцкія выбары, на маю думку, не ставілі для сябе сур'ёзных задач. Я зьяўляюся пасьлядоўным прыхільнікам аб'яднаньня дэмакратычных сіл і лічу, што слабая, разрозьненая палітычная апазіцыя ня можа дасягнуць колькі-небудзь значных мэтаў. Але што цікава – выбарчы махавік мабілізаваў людзей. Аналізуючы інфармацыю пра людзей, якія выйшлі на плошчу 19 сьнежня, можна прыйсьці да высновы, што яны зрабілі гэта не столькі ў падтрымку таго ці іншага кандыдата, колькі пратэстуючы супраць Лукашэнкі і патрабуючы дэмакратыі і свабоды. Пратэстнай акцыі такога маштабу мала хто чакаў. Але, нягледзячы на перадвыбарную блытаніну і пагрозы жорсткага падаўленьня пратэстаў, якія агучваліся прадстаўнікамі ўлады напярэдадні выбараў, людзі выйшлі на плошчу. Гэта ў чарговы раз паказала, што дэмакратычна арыентаваная частка грамадства ў Беларусі дастаткова вялікая, стабільная і прадстаўлена лепшымі людзьмі.

Такі жорсткі разгон мітынгу стаў для нас яшчэ адной нечаканасьцю. Я быў на акцыі і магу сьведчыць: калі б ва ўладаў было хаця б мінімальнае жаданне забясьпечыць яе мірны зыход – зрабіць гэта ім ня склала б цяжкасьцяў. Невядома, хто ініцыяваў біцьцё шкла ў вокнах і дзьвярах Дома Урада, але нават гэтыя дзеяньні, на маю думку, ня цягнуць за сабой крымінальную адказнасьць.

Акцыя, тым ня менш, была жорстка падаўлена, больш за семсот чалавек былі асуджаныя ў адміністрацыйным парадку: аштрафаваныя ці адбывалі суткі. Але маштабная кампанія рэпрэсіяў толькі набрала абароты, яна працягваецца і па гэты дзень. Толькі наша арганізацыя зафіксавала каля дзьвюх сотняў ператрусаў і яшчэ больш допытаў, праведзеных у краіне (хоць мы маем далёка не поўныя зьвесткі). Колькасьць абвінавачаных і падазраваных па крымінальнай справе аб масавых беспарадках перавалiла за 50 чалавек, сямёра з іх ужо асуджаны. Гэта беспрэцэдэнтная сітуацыя. Такога маштабу рэпрэсіяў у краіне не было ніколі.

Працягваецца перасьлед палітычных і грамадскіх актывістаў. Гэтая хваля ціску ўжо не зьвязана з тым, што адбывалася перад выбарамі і падчас выбараў - улады проста выкарыстоўваюць узбуджаную крымінальную справу для таго, каб расправіцца з палітычнымі актывістамі, праваабаронцамі і журналістамі, пасеяць страх у грамадстве. Я перакананы, што гэта не атрымаецца, паколькі значная частка беларускага грамадства арыентаваная на дэмакратычныя каштоўнасьці, пратэстны патэнцыял высокі і загнаць яго ў падполле магчыма толькі на кароткі час.

**Непрапарцыйна жорсткая рэакцыя беларускіх уладаў на акцыі пратэсту выглядала вельмі нелагічна на фоне дастаткова пасьпяховага перамоўнага працэсу з Еўрапейскім Саюзам. Чаму гэта адбылося?**

На фоне таго, як Лукашэнка вёў сябе ўсе гэтыя 16 гадоў, усё вельмі нават лагічна. Калі параўноўваць рэакцыю на акцыі пратэсту, напрыклад, у 1996 і 2006 гадах, можна пераканацца, што ў сьнежні 2010 не адбылося нічога незвычайнага. За ўвесь час прэзідэнцтва Лукашэнкі я ня памятаю перыяду, калі ў краіне не было б палітычных зьняволеных. Іх колькасьць у розныя часы зьмянялася, але заўсёды хто-небудзь падвяргаўся перасьледу. Мы можам сьведчыць аб гэтым, як арганізацыя, якая з 1998 году вядзе хроніку парушэньняў правоў чалавека ў рэспубліцы. Штогод ад тысячы да 3-х тысяч чалавек у краіне падвяргаліся рознага роду рэпрэсіям - ад перасьледаў КДБ да звальненьня з працы за палітычную ці грамадскую актыўнасьць. З 1996 году грамадзянская супольнасьць стала знаходзіцца пад прэсінгам уладаў. І як раз «пераміре» апошніх паўтары гады – гэта і ёсьць выключэньне з правілаў.

Але калі ўважліва паглядзець на «спакойны» 2010 год, мы нават там зможам заўважыць міні-крызісы. Мы памятаем пра двух асуджаных да сьмяротнага пакараньня і двух расстраляных вясной мінулага году. Вынесеныя і выкананыя прысуды, на маю думку, маюць палітычную падаплёку – прэзідэнт такім чынам адрэагаваў на адмову Беларусі ў статусе назіральніка пры Савеце Еўропы. Мы памятаем аб прыняцьці ў 2010 годзе закону аб інтэрнэце, які яшчэ не ўжываецца, але абавязкова «стрэліць», у будучыні, як толькі ўлады разьбяруцца са спосабамі яго прымяненьня.

Праваабаронцы ня мелі асаблівых ілюзіяў наконт палітыкі лібералізацыі, якую абвясьцілі беларускія ўлады і папярэджвалі аб тым, што ніякіх структурных зьменаў не адбываецца і сітуацыя ў любы момант можа вярнуцца ў звыклае рэчышча. Мы адзначалі гэта і ў альтэрнатыўным Універсальным перыядычным аглядзе (UPR), які разглядаўся на сэсіі Савету правоў чалавека ААН у Жэневе вясной 2010 году. Улада абсалютна ўпэўненая ў правільнасьці сваіх крокаў. Мы перакананыя ў адваротным. Таму ў нас такая несумяшчальнасьць. Самае галоўнае тое, што мы вытрымалі першы ўдар.

**За мінулыя амаль тры месяцы адбылося шмат падзеяў – што найбольш ўрэзалася ў памяць?**

Дыхнула трыццатымі. Перад выбарамі Раманчук «нападаў» на тых еўрапейскіх дэпутатаў, якія прыязджалі ў Менск, і абвінавачваў іх у тым, што сваім прыездам яны забясьпечваюць легітымнасьць Лукашэнкі, рабіў рэзкія заявы ў адрас апошняга. А потым, пасьля чатырохгадзіннай размовы з аховай прэзідэнта, Раманчук выступіў з заявай: ён выйшаў з пакамечанай паперкай, зьмест якой, запінаючыся, прачытаў. ¨н абгаварыў іншага кандыдата ў прэзідэнты А. Саннікава і ягоную жонку – журналістку І. Халіп і потым доўга ня мог спыніцца, спрабуючы апраўдацца. Гэтак жа было ў трыццатыя, калі верныя ленінцы прызнаваліся і прасілі справядлівы суд пакараць іх самым суровым пакараньнем. Усё гэта выклікала ня тое каб абурэньне, хутчэй, зьдзіўленьне – дзе мы? Відавочна, што пальцы ў дзьверы Раманчуку ніхто не заціскаў, але аказаны псіхалагічны ціск яго зламаў. А іншы кандыдат у прэзідэнты Алесь Міхалевіч, які толькі нядаўна быў вызвалены з СІЗА КДБ пад падпіску аб нявыезьдзе заявіў, што да яго ўжываліся катаваньні і што яго прымусілі падпісаць паперу аб супрацоўніцтве з КДБ з умовай, што толькі тады ён убачыць свабоду.

Улады, не саромеючыся, заяўляюць, што ўмовай выхаду на свабоду палітычных зьняволеных зьяўляецца пакаяньне. Ствараецца ўражаньне, што падобнае публічнае прыніжэньне апанентаў прыносіць Лукашэнку асаблівую садысцкую асалоду.

**Што можа паўплываць на сітуацыю?**

Мы, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасьці, імкнемся дзейнічаць шляхам перакананьня, логікай, фактамі – быць свайго роду фасілітатарамі паміж ахвярамі і ўладамі. У дэмакратычных краінах такая дзейнасіць прыносіць вынікі. У нашай «чорна-белай» сітуацыі трэба гуляць па шахматным правілах. Па-іншаму не атрымаецца. Зараз ўладамі грамадзянскай супольнасіці фактычна аб'яўлена вайна. Спадзяюся, мы выстаім ў гэтай вайне. Калі не, то краіну чакае варыянт Кубы – у турмах будуць сядзець ужо не 30, а 300 палітычных і грамадскіх актывістаў, а астатнія будуць вымушаныя сысьці ў глыбокае падпольле.

Нам вельмі пашанцавала з тым, што мы зьяўляемся суседзямі Еўрапейскага Саюзу, а такое становішча справаў у краіне ўяўляе небясьпеку для ЕС. Тое, што адбываецца ў Беларусі, супярэчыць еўрапейскай памежнай палітыцы, мэтай якой ёсьць садзейнічаньне стварэньню стабільнай і прадказальнай палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў суседніх дзяржавах. Тут гэтага няма і блізка. У адказ на фальсіфікацыю выбараў і жорсткі разгон мірнай дэманстрацыі пратэсту ЕС увёў палітычныя санкцыі ў дачыненьні да беларускіх чыноўнікаў. Еўрапейскія палітыкі сьцвярджаюць, што калі будуць і далей груба парушацца правы чалавека, калі ў краіне будуць палітычныя зьняволеныя, вельмі магчыма ўвядзеньне і некаторых эканамічных санкцыяў. Я думаю, што ЕС будзе і надалей рэагаваць адпаведным чынам. Ня думаю, што на заходнім напрамку ў беларускіх уладаў у бліжэйшыя пяць гадоў будуць нейкія посьпехі. Лукашэнка сам вызначыў гэты тэрмін – да наступных выбараў.

**Ці возьмецеся Вы зрабіць прагноз: як будуць развівацца падзеі?**

Я лічу, што Еўрапейскі Саюз, які будуе сваю палітыку на прынцыпах дэмакратыі і патрабуе павагі гэтых прынцыпаў ад краінаў, з якімі ён супрацоўнічае, не павінен рабіць выключэньняў для Беларусі. На маю думку, эканамічныя адносіны ЕС са сваімі суседзямі, у тым ліку і з Беларусьсю, павінны адпавядаць палітычным.

Зараз у краіне душаць грамадзянскую супольнасьць. Вядома, метады іншыя, чым гэта было ў трыццатых гадах. Але атмасфера вельмі нагадвае тыя часы – людзей ламаюць за адну ноч, вымушаюць рабіць публічныя прызнаньні і пасыпаць галаву попелам. Фармуецца вобраз зьнешняга ворага. Такім ворагам ледзь было ня стала Расея, але ў апошні момант улады перадумалі і абвінавацілі Польшчу з Германіяй, вырашыўшы, што гэта больш звыклы і зразумелы абывацелю вобраз. Я думаю, што ціск на грамадзянскую супольнасьць з боку беларускіх уладаў будзе ўзмацняцца.

**У лютым Вас папярэдзілі за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Якія наступствы Вы чакаеце?**

Так, 16-га лютага мяне выклікалі ў Генеральную пракуратуру РБ, дзе ўручылі афіцыйнае папярэджаньне па крымінальным артыкуле 193.1 КК РБ за дзейнасьць ад імя незарэгістраванага грамадскага аб'яднаньня "Праваабарончы цэнтр "Вясна". Тым ня менш, яшчэ ў 2009 годзе, пасьля таго як нам тройчы адмовілі ў рэгістрацыі і магчымасьці атрыманьня легальнага статусу, мы заяўлялі, што будзем і далей працягваць праваабарончую працу. 17 лютага ў адказ на папярэджаньне Генпракуратуры Рада «Вясны» прыняла заяву, што мы расцэньваем гэта як спробу запалохваньня актывістаў арганізацыі і ўсяга праваабарончага руху Беларусі. Мы лічым сваю праваабарончую дзейнасць абсалютна законнай, запатрабаванай беларускай грамадскасьцю і не спынім яе, нягледзячы на відавочную пагрозу з боку ўладаў.

***Яніна Стэфанчук***

# *Каляндар памятных і круглых датаў Гарадзеншчыны на красавік 2011 году*

**1 красавіка**
35 гадоў таму (1976) – Памёр Іван Тарасюк, удзельнік беларускага патрыятычнага падпольля на Слонімшчыне ў 1946-47. Пахаваны ў Слоніме. Нараджэнец в. Глоўсевічы.

**4 красавіка**
165 гадоў таму (1846) – Памёр Леан Бароўскі, літаратуразнавец, педагог. У 1807-11 быў выкладнікам паэтыкі і рыторыкі ў Сьвіслацкай гімназіі.

**10 красавіка**
80 гадоў таму (1931) – У в. Чамяры (Слонімскі р-н) нарадзіўся Іван Чыгрын, беларускі літаратуразнавец, паэт, крытык.

**13 красавіка**
140 гадоў таму (1871) – У мяст. Лугіна (Марыямпальскі пав., цяпер Летува) нарадзіўся Юры Матулевіч, рымска-каталіцкі рэлігійны дзеяч Заходняй Беларусі і Летувы, блаславёны.

**17 красавіка**
120 гадоў таму (1891) – На Сакольшчыне (Беласточчына) нарадзіўся Язэп Варонка, беларускі палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст, дзеяч эміграцыі (ЗША). Адзін з заснаваньнікаў у Гародні таварыства “Бацькаўшчына”.

**18 красавіка**
Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясьцін.

**20 красавіка**
345 гадоў таму (1666) – На Слонімшчыне нарадзіўся Крыштап Станіслаў Завіша, пісьменьнік-мемуарыст, перакладнік, аратар, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага.

**24 красавіка**
145 гадоў таму (1866) – Нарадзіўся Анатоль Касьперскі (верагодна ў Галынскай гміне, дата сьмерці невядомая), беларускі настаўнік, арганіст, вясной 1924 быў пробашчам у Бераставіцы.

**26 красавіка**
Дзень памяці ахвяраў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (1986).

125 гадоў таму (1886) – У в. Лынкішкі (Астравецкі р-н) нарадзіўся Юльян Бароўка, беларускі рымска-каталіцкі сьвятар, працаваў у Гародні, у 1923 служыў у Барунах (Ашмянскі р-н), з 1937 у Рэплі (Ваўкавыскі р-н), дзе і памёр.

**28 красавіка**
100 гадоў таму (1911) – У в. Панямонь (Навагрудскі р-н) нарадзіўся Васіль Каляда, актывіст КПЗБ, настаўнік, у 1959-69-дырэктар Дома-музэю Адама Міцкевіча ў Навагрудку.

**29 красавіка**
80 гадоў таму (1931) – Памёр Яўхім Карскі, беларускі філолаг-славіст, мовазнавец, літаратуразнавец, фальклярыст, этнограф, палеограф, археограф, бібліёграф, пэдагог, заснаваньнік навуковага беларусазнаўства. Нараджэнец в. Лаша (Гарадзенскі р-н). Пахаваны ў Санкт-Пецярбургу.


РАЦЫЯ 98,1 99,2 FM

***Кожны аўторак у эфіры незалежнай радыёстанцыі “Радыё Рацыя” - праграма “Людзьмі звацца!”, якая асвятляе падзеі, датычныя правоў чалавека на Беларусі. Час выхаду ў эфір – 15-05 (паўтор - серада 0:05-1:00 і субота 7:05-8:05). Таксама ў гэты час яе можна слухаць праз інтэрнэт на сайце***

**www.racyja.com**

***Праваабарончую інфармацыю па Беларусі вы можаце атрымаць на сайце***

**www.spring96.org**



Гарадзенскі праваабарончы
інфармацыйна-аналітычны
бюлетэнь «Прэзумпцыя»
выходзіць 1 раз у месяц
наклад 299 асобнікаў
для нутранога карыстаньня

падрыхтаваны да друку:
29. 03. 2011
e-mail:prezumpcyja@gmail.com
распаўсюджваецца задарма
пры передруку спасылка
абавязковая


